## У БЕЛАРУСІ ЎСТАНОЎЛЕНЫ ПАРАДАК АДЧУЖЭННЯ ЖЫЛЫХ ДАМОЎ СЕЛЬГАСАРГАНІЗАЦЫЙ

**Адпаведны ўказ № 253 «Аб асобных пытаннях куплі-продажу жылых дамоў (кватэр) сельскагаспадарчых арганізацый» 17 чэрвеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

«Указ устанаўлівае парадак адчужэння жылых дамоў (кватэр) для сельскагаспадарчых арганізацый дзяржаўнай уласнасці. У інтарэсах сельскагаспадарчых арганізацый устанаўліваецца, што жылыя памяшканні, пабудаваныя (набытыя) за кошт бюджэтных сродкаў і (або) з прыцягненнем ільготных крэдытаў, падлягаюць продажу па цане не меншай за суму сродкаў, затрачаных на будаўніцтва (рэканструкцыю, набыццё) гэтых жылых памяшканняў», — паведамілі ў прэс-службе.

Продаж прыналежных сельскагаспадарчым арганізацыям жылых памяшканняў грамадзянам будзе садзейнічаць замацаванню работнікаў у сельскай мясцовасці і дасць магчымасць скараціць расходы сельгасарганізацый на ўтрыманне і абслугоўванне жыллёвага фонду.

## У БЕЛАРУСІ АДМЯНЯЕЦЦА ВЫДАЧА ДАВЕДКІ, ЯКАЯ ПАЦВЯРДЖАЕ ПРАВА НА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ БАНКАЎСКАГА ПЕРАВОДУ ГРАШОВЫХ СРОДКАЎ ФІЗІЧНАЙ АСОБЕ

**Адпаведны Указ № 254 «Аб унясенні змянення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 лютага 2006 г. № 71» 17 чэрвеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Скарачэнне гэтай адміністрацыйнай працэдуры значна зменшыць часавыя затраты юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама ліквідуе лішнія адміністрацыйныя бар'еры пры ажыццяўленні імі прадпрымальніцкай дзейнасці.

## БЕЛАРУСЬ РАШУЧА АСУДЖАЕ ПРЫНЯЦЦЕ Ў САВЕЦЕ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА ААН ПАЛІТЫЧНА МАТЫВАВАНАЙ І НЕАБГРУНТАВАНАЙ РЭЗАЛЮЦЫІ

**Аб гэтым гаворыцца ў каментарыі начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС Андрэя Савіных у сувязі з прыняццем у Савеце па правах чалавека ААН рэзалюцыі па Беларусі, паведамляе БЕЛТА.**

«Беларусь рашуча асуджае прыняцце ў Савеце па правах чалавека палітычна матываванай і неабгрунтаванай рэзалюцыі па Беларусі. Гэты дакумент з'яўляецца прадуктам прэваліруючых у Брусэлі ангажыраваных і не падмацаваных фактамі ацэнак сітуацыі ў Беларусі, разлічаных на тое, каб прадставіць нашу краіну як асаблівы выпадак невыканання абавязацельстваў у праваахоўнай сферы», — падкрэсліў Андрэй Савіных.

Паводле яго слоў, адсутнасць падтрымкі рэзалюцыі па Беларусі з боку большасці дзяржаў — членаў Савета па правах чалавека з усёй відавочнасцю паказала, што гэты дакумент не з'яўляецца адлюстраваннем агульнага меркавання міжнароднай супольнасці адносна сітуацыі ў Беларусі і ў сувязі з гэтым не заслугоўвае даверу.

«Беларусь у поўнай меры выконвае і мае намер у далейшым выконваць свае абавязацельствы, узятыя ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі па правах чалавека. Беларусь выступае за адкрыты, узаемапаважлівы і раўнапраўны дыялог па правах чалавека без дыскрымінацыі і двайных стандартаў», — дадаў Андрэй Савіных.

## У БЕЛАРУСІ Ў СТУДЗЕНІ—КРАСАВІКУ САМЫЯ ВЫСОКІЯ Ў СНД ТЭМПЫ РОСТУ ВУП, ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ І ІНВЕСТЫЦЫЙ

**У Беларусі за студзень—красавік адзначаны самы высокі сярод краін СНД тэмп росту валавога ўнутранага прадукту — 112,3 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду 2010 года, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце са спасылкай на даныя Статкамітэта СНД.**

Згодна з апошнімі данымі, сярод краін СНД высокія паказчыкі па тэмпе росту ВУП дасягнуты ў Казахстане — 106,5 працэнта за студзень-люты. У студзені—сакавіку ў Расіі тэмп росту ВУП склаў 104,1 працэнта, ва Украіне — 105,2 працэнта.

Па тэмпах росту вытворчасці прамысловай прадукцыі ў Беларусі таксама самы высокі паказчык сярод краін СНД. Ён склаў за студзень—красавік 112,9 працэнта. У Расіі аб'ёмы прамысловай вытворчасці ўзраслі на 5,5 працэнта, ва Украіне — на 8,5 працэнта, Казахстане — на 6,1 працэнта.

Інвестыцыі ў асноўны капітал у Беларусі за чатыры месяцы павялічыліся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 23,4 працэнта. У Расіі тэмп росту інвестыцый склаў 100,1 працэнта, Казахстане — 104,1 працэнта, ва Украіне за студзень—сакавік — 112 працэнтаў.

## ПАВЯЛІЧАНЫ СКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ НА КАШТОЎНЫЯ МЕТАЛЫ

**Пастановай Міністэрства фінансаў зацверджаныя новыя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, што скупліваюцца ў фізічных асоб (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асоб) і пастаўляюцца ў Дзяржфонд. Апошні раз яны змяняліся з 1 красавіка, а перад тым — з 1 лістапада мінулага года. Новыя цэны ўступілі ў сілу з 20 чэрвеня.**

Цяпер будуць дзейнічаць наступныя скупачныя цэны ў рублях па пробах за грам металу. Золата ў вырабах і ломе: 375-пробы — 75 350 рублёў за грам металу (з 1 красавіка было 42 780 рублёў за грам металу); 500-й пробы — 100 470 рублёў (было дагэтуль 57 040 рублёў); 583-й і 585-й пробы — 117 550 рублёў (66 740 рублёў); 750-й пробы — 150 710 рублёў (85 560 рублёў); 900-й пробы — 180 850 рублёў (102 670 рублёў); 916-й пробы — 184 060 рублёў (104 500 рублёў); 950-й пробы — 190 890 рублёў за грам металу (было 108 380 рублёў).

Плаціна ў вырабах і ломе зараз ацэненая: за грам металу 950-й пробы — 225 140 рублёў (да нядаўняга часу дзейнічала скупачная цана 136 240 рублёў). Новыя закупачныя цэны на серабро ў вырабах і ломе за грам металу такія: 750-й пробы — 3 630 рублёў (з 1 красавіка было 2 120 рублёў); 800-й пробы — 3 870 рублёў (2 260 рублёў); 875-й пробы — 4 240 рублёў (2 470 рублёў); 916-й пробы — 4 430 рублёў (2 580 рублёў); 925-й пробы — 4 480 рублёў (2 610 рублёў); 960-й пробы — 4 650 рублёў за грам металу (да гэтага было 2 710 рублёў).

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

### Жанчына на плаўсродку — сігнал бедства

На возеры Смуга ў Брэсцкім раёне цярпела бедства маладая брастаўчанка на надзіманым матрацы. 33-гадовая гараджанка адпачывала разам з мужам на беразе возера. Але вырашыла паплаваць на матрацы. Раптам падняўся вецер, і яе аднесла даволі далёка ад берага. А плаўсродак тым часам пачаў спускаць паветра. Тады муж кабеты, што цярпела бедства, патэлефанаваў у МНС. На месца прыбылі супрацоўнікі вадалазна-выратавальнай службы і эвакуявалі гаротніцу на лодцы.

### Неслася на скутары

Навучэнка каледжа 1993 года нараджэння кіравала скутарам у Пінску, хоць правоў на кіраванне не мела. Да таго ж вершніца «жалезнага каня» хуткасны рэжым не захоўвала, бо на дарозе збіла вучня чацвёртага класа. Хлопчык атрымаў пералом рукі і сінякі. А гора-кіроўца з месца здарэння ўцякла, але хутка была ўстаноўлена работнікамі міліцыі.

**Яна СВЕТАВА.**

## Ордэнам Маці ўзнагароджаны 17 шматдзетных жанчын з Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20 чэрвеня падпісаў указ № 255, у адпаведнасці з якім 17 шматдзетных жанчын з Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей узнагароджаны ордэнам Маці.**

Гэтай узнагароды ўдастоены дырэктар прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Гармонія-Стыль» з Гомеля Надзея Бярэшчанка, аператар машыннага даення раённага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Саўгас «Лідскі» (Гродзенская вобласць) Наталля Корсак, жывёлавод СВК «Наша Радзіма» (Слаўгарадскі раён, Магілёўская вобласць) Валянціна Сталбанава і інш.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў часова выконваючага абавязкі Прэзідэнта Малдовы Марыяна Лупу з днём нараджэння

«Пераканаsuccessful, што далейшае ўмацаванне беларуска-малдаўскага палітычнага дыялога, актыўнае міжурадавае ўзаемадзеянне, пашырэнне міжрэгіянальных сувязяў будуць садзейнічаць эфектыўнай рэалізацыі значнага патэнцыялу супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі», — гаворыцца ў віншаванні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Футбол. Чэмпіянат Еўропы

## ФАРТУНА АДДАЕ ДАЎГІ: НАВАТ ПАСЛЯ РАЗГРОМУ АД ШВЕЙЦАРЦАЎ НАША «МАЛАДЗЁЖКА» ВЫЙШЛА Ў ПЛЭЙ-ОФ

**На чэмпіянаце Еўропы па футболе выступленне беларускай зборнай пакідае не самыя лепшыя ўражанні: пасля перамогі над ісландцамі (2:0) падапечныя Георгія Кандрацьева прайгралі датчанам (1:2), а ў заключным матчы былі разгромлены швейцарцамі — 0:3. Аднак абыграныя намі ісландцы прыпаднеслі нам нечаканы падарунак — выйгралі ў датчан. У выніку па лепшых дадатковых паказчыках у плэй-оф выходзіць менавіта наша каманда!**

Для выхаду ў плэй-оф нам, здавалася, нельга было саступаць, аднак мы прайгралі. Толькі самы пачатак паядынку супраць швейцарцаў можна занесці ў актыў нашай зборнай. Аднак ужо з шостай хвіліны ў ліку вёў супернік: да пенальці прывяла грубая памылка Верацілы. На 43-й хвіліне памыліўся Філіпенка, і лік падвоіўся. У другім тайме з 65-й хвіліны беларусы засталіся ў меншасці пасля выдалення Матвейчыка, і на 93-й хвіліне лік стаў разгромным.

Але спрацаваў самы неверагодны варыянт. У паралельнай сустрэчы ісландцы, якія прайгралі дзве стартавыя сустрэчы, нарэшце прачнуліся і абыгралі датчан (3:1). Такім чынам, першае месца ў групе занялі швейцарцы, якія не прайгралі ніводнай сустрэчы, а ў датчан, ісландцаў і беларусаў стала па 3 ачкі. І па лепшых паказчыках у асабістых сустрэчах лепшай аказалася наша каманда!

Тым часам нашы гульцы пакрыўдзіліся на журналістаў, якія раскрытыкавалі выступленне зборнай, і прынялі рашэнне з прэсай не кантактаваць. Вось што напісаў у сваім блогу Станіслаў Драгун: «Якая розніца, як мы выйшлі ў плэй-оф? Навошта пісаць «няхай едуць дадому»? Да чэмпіянату ўсе казалі, што ў нас роўная група і ўсё можа залежаць ад розніцы мячоў. Гэта вельмі хуткі турнір і выйсці ў паўфінал магла любая з каманд. Так у выніку і атрымалася. Мы што, усіх граміць там павінны былі? Людзі не разумеюць, што ў той жа Ісландыі ці Даніі, не кажучы ўжо пра Швейцарыю, ёсць гульцы, якія ў адзіночку каштуюць больш, чым уся наша каманда».

А вось за пуцёўку на Алімпіяду прыйдзецца пазмагацца: англічане, у адрозненне ад ісландцаў, падарунка нам не зрабілі. У матчы з чэхамі яны вялі ў ліку аж да 89-й хвіліны. Але чэхі не здаваліся да апошняга і забілі ў канцоўцы сустрэчы два мячы. У выніку ў паўфінал англічане не выйшлі, і тры пуцёўкі на Алімпіяду прыйдзецца падзяліць паміж чатырма паўфіналістамі — гэта чэхі, іспанцы, швейцарцы і беларусы. Іх атрымаюць абодва фіналісты, а дзве астатнія каманды правядуць дадатковы матч за права трапіць у Лондан-2012. Застаецца дадаць, што ў паўфінале наша каманда сустрэнецца з Іспаніяй. Шанцы на перамогу невялікія, але нам застаецца толькі верыць у каманду. Паўфіналы пройдуць 22 чэрвеня, а фінал адбудзецца 25-га.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### БАТЭ згуляе з «Лінфілдам» у Лізе чэмпіёнаў

Беларускія клубы пачынаюць свой еўракубкавы сезон. Учора ў швейцарскім Ньёне адбылося лёсаванне папярэдніх раўндаў Лігі чэмпіёнаў і Лігі Еўропы. Так у супернікі барысаўчанам у 2-м раўндзе Лігі чэмпіёнаў дастаўся паўночнаірландскі «Лінфілд». Першы матч (12/13 ліпеня) БАТЭ правядзе ў гасцях, другі (19/20 ліпеня) згуляе дома. У Лізе Еўропы «Мінск» стартуе з 1-га раўнда матчам супраць азербайджанскага «Алімпіка» 30 ліпеня ў Мінску, сустрэча ў адказ — 7 ліпеня ў Баку. «Шахцёр» атрымаў у супернікі латвійскі «Вентспілс». Барацьба пачнецца з 2-га раўнда: 14 ліпеня дома і 21 ліпеня — на выездзе.

### Беларускія баскетбалісткі датэрмінова выйшлі з групы

**На жаночым чэмпіянаце Еўропы па баскетболе, які ў суботу стартаваў у Польшчы, нашы дзяўчаты выйгралі дзве стартавыя сустрэчы і датэрмінова выйшлі ў другі этап. У суботу беларускі перамаглі англічанак — 55:40, у нядзелю яшчэ з больш камфортнай перавагай адолелі ізраільцянак — 68:41.**

Лепшымі бамбардзірамі ў суботнім матчы сталі Настасся Верамеенка і Кацярына Сныціна, якія набралі па 10 ачкоў. У нядзельнай сустрэчы лепшымі былі Наталля Марчанка і Таццяна Ліхтаровіч. Учора ўвечары ў заключным групавым матчы беларускі імкнуліся ўзяць рэванш у чэшак за крыўднае для нас судзейства на чэмпіянаце свету.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Абзац

◢ **На 1 студзеня гэтага года ў рэспубліцы пражывалі 2 млн 345 тыс. чалавек ва ўзросце ад 14 да 31 года, сярод іх 51 працэнт мужчын і 49 працэнтаў жанчын. Найбольш шматлікая ўзроставая група сярод моладзі — маладыя людзі ва ўзросце 25-30 гадоў. Іх колькасць на пачатак гэтага года склала 903,2 тыс. чалавек і ў параўнанні з пачаткам 2000 года павялічылася на 77,3 тыс. чалавек, або на 9,4 працэнта.**

◢ Суд Ленінскага раёна Мінска прызнаў менеджара адной са сталічных фірмаў вінаватым у незаконным набыцці ў мэтах збыту і збыце спецыяльных тэхнічных сродкаў, прызначаных для тайнага атрымання інфармацыі, паведамілі ў Цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Беларусі. Сёлета ў красавіку ён спрабаваў незаконна збыць малагабарытныя відэа- і аўдыязапісваючыя ўстройствы. Прыборы былі закамуфліраваны пад бірулькі аўтамабільнай сігналізацыі і гадзіннік. Акрамя таго, у мужчыны канфіскавалі радыёэлектронныя ўстройствы з функцыямі атрымання акустычнай інфармацыі і перадачы яе па канале GSM. Яны прызначаліся для незаконнага збору інфармацыі аб прыватным жыцці жыхароў Беларусі. Суд назначыў абвінавачанаму пакаранне ў выглядзе штрафу ў памеры Br5,25 млн.

◢ **Арганізацыі Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў (Белкаапсаюза) могуць арандаваць месцы на камунальных рынках Мінска для рэалізацыі вітаміннай прадукцыі айчыннай вытворчасці за мінімальную плату. Адпаведнае рашэнне прыняў Мінгарвыканкам. Галоўная ўмова для атрымання такой скідкі — рэалізацыя беларускай вітаміннай прадукцыі па цэнах, ніжэйшых за сярэдні ўзровень цэн на рынку не менш як на 10 працэнтаў.**

◢ 18 чэрвеня на чыгуначным пераездзе ў Брэсце, кінуўшыся пад дызель-цягнік Брэст—Дубіца, 36-гадовы мясцовы жыхар спрабаваў скончыць жыццё самагубствам, але застаўся жывы. Ён быў дастаўлены ў бальніцу з дыягназам «адкрытая чэрапна-мазгавая траўма, удар галаўнога мозга, субараідальнае кровазліццё, множныя ўдары галавы, пералом асновы чэрапа». Мужчына быў у стане алкагольнага ап'янення.

◢ **Грамадзянін Літвы спрабаваў перавезці праз беларускую мяжу 60 кг гашышу. У пункце пропуску «Каменны Лог» падчас надгляду грузавога аўтамабіля «DAF» у спальным адсеку кабіны смаргонскія памежнікі выявілі тры сумкі, якія былі набіты брыкетамі, абкручанымі цэлафанам і скотчам, вагой каля 60 кг. У выніку экспрэс-аналізу ўстаноўлена, што змесціва брыкетаў з'яўляецца наркатычным рэчывам — гашышам.**

◢ Найстарэйшы зняволены Індыі — 108-гадовы святар Брыдж Біхары Пандзей — выйшаў на волю. Два гады ён правёў у турме. Пандзея вырашана было выпусціць на волю па гуманітарных меркаваннях. Састарэлы святар меў патрэбу ў пастаянным доглядзе і медыцынскай дапамозе. Брыдж быў прысуджаны да зняволення ў 2009 годзе за злачынства, якое было здзейснена больш 20 гадоў таму. Тады, у 1987 годзе, 84-гадовы святар разам з 15 саўдзельнікамі, у асноўным членамі сваёй сям'і, забіў чатырох чалавек.

### Поўны абзац

◢ **Чатырохгадовы жыхар Казахстана Жэня Галавін выйграў судовы працэс супраць мясцовага дзяржаўнага цырка, размешчанага ў Алматы. Заяву ад імя свайго сына падала маці дзіцяці. Прэтэнзіі хлопчыка датычыліся цыркавога прадстаўлення, на якім ён так і не ўбачыў нумары з заяўленымі ў афішах дрэсіраванымі львом і тыграм. Жанчына запатрабавала вярнуць ёй грошы за квіткі, а таксама выплаціць 900 тысяч тэнге ў якасці кампенсацыі маральнай шкоды. Аднак суд зменшыў памер кампенсацыі у 30 разоў, да 30 тысяч тэнге (крыху больш за 200 долараў ЗША).**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# ПАРАД НЯВЕСТАЎ-2011

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Ужо на ўваходзе ў парк Горкага, дзе ў нядзелю праходзіў парад нявестаў, можна было зразумець, што нешта тут не так. Усе кудысьці глядзелі. Вось мяне, напрыклад, з ветрам абагналі дзве смуглявыя, нізенькага росту жанчынкі. Толькі пяткі блішчалі. Як высветлілася пазней, гэта былі Джавана Аўджасціні і Чыньцыя Дэпрост з Італіі, якія ўпершыню прыехалі ў Мінск. У размове з карэспандэнтам «Звязды» жанчыны эмацыйна распавядалі, што нічога падобнага раней яны не бачылі, праз слова ўстаўляючы італьянскае слова «рагаццы».

— Мы беглі, бо хацелі разглядзець сукенкі і прычоскі. Было вельмі прыгожа!!! Усё супер — і атмасфера, і энергія! У вас вельмі прыгожыя дзяўчаты. У Італіі таксама, але ў нас яны больш какетлівыя.

### Пра букет «мужчынская годнасць» і голы торс Сашы Нэма

Больш за дзве гадзіны сталічныя нявесты прагульваліся па парку Горкага. Толькі лянівы не падышоў паглядзець на такое дзіва. Амаль паўсотні размаляваных нявестаў! Таму, хто не ведаў, што тут адбываецца, і зусім магло падацца, што гэта парад нетрадыцыйнай меншасці або масавы флэшмоб.

Як расказала **арганізатар парада нявестаў, аўтар і кіраўнік інтэрнэт-праекта prazdnik.by Алеся КАКОШНІКАВА**, трапіць у лік нявестаў было не так і проста. Дзяўчат выбіралі амаль з 1300 (!) пададзеных заявак.

Усіх дзяўчат падзялілі на сем камандаў, па сем нявестаў у кожнай. Адным з галоўных момантаў стала ўскладанне дзяўчатамі кветак да помніка на плошчы Перамогі. Каго тут толькі ні было: антычныя нявесты, нявесты-«свецкія дамы», нявесты-кінадзівы, нявесты-«а-ля Шанель», «нявесты Gold Wing», NEW-нявесты (незамужнія журналісткі), нявесты ў стылі Пінк... Не хапала, відаць, толькі нявестаў-готаў і нявестаў-медсястрычак. Пасля адмысловага канцэрту, на якім выступілі Георгій Калдун, Вера Карэтнікава, Юрый Неўмяржыцкі і інш., нявесты выпусцілі ў неба 100 балонікаў.

Каб высветліць, чыя ж каманда лепшая, арганізатары пасля прагулак па парку павезлі дзяўчат у сталічны клуб «Арыён».

Там нявестаў чакаў невялічкі фуршэт і конкурсы. Адным з найбольш цікавых стаўся выраб букета з падручных прадметаў: трэба было даць букету назву і абараніць свой праект. Фантазія і адсутнасць мужчынскай пяшчоты на працягу дня давала пра сябе знаць: букеты асобных камандаў называліся «мужчынская годнасць» і «жаночы аргазм».

Пазней былі і конкурсы для балельшчыкаў, асобныя прадстаўнікі якіх гарлапанілі так, нібыта ў мінулым жыцці штодня на гладыятарскія баі хадзілі. Са свецкай тусоўкі на вечарыне былі заўважаны артысты Улада (адна з суарганізатараў праекта), Галіна Шышкова і Саша Нэма. Апошні, да слова, прыйшоў у клуб з маленькай дачкой.

Калі ж конкурсы скончыліся, Саша Нэма выканаў для нявестаў некалькі сваіх песень, скінуўшы ў парыве палкасці сваю кашулю і дэманструючы ўсім нявестам свой накачаны торс. Пабачыўшы такое, некаторыя нявесты ашалела кінуліся ў скокі, адрываючыся, як кажуць, па поўнай...

Лепшай у выніку прызналі каманду «Нявесты Gold Wing». Але кожная з камандаў атрымала падарункі ад «Кампаніі Лаоры» — касметыку і парфюм. Між іншым, а што яшчэ дзяўчатам трэба? Хоць што б там ні казалі, а ў вачах дзяўчат іскрылася радасць. Не кожны дзень яны прымяраюць сукенкі, не кожны дзень ім удзяляюць такую ўвагу мужчыны.

І гледзячы, як па-дзіцячы шчыра ўсміхаліся ўдзельніцы, было зразумела: «парад нявестаў» — гэта не даніна модзе, гэта адзін са спосабаў сказаць мужчынам: «Будзьце смялейшымі...»

**Ілья ЛАПАТО. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**








## ЗАБОЙЦУ НА МАПЕДЗЕ ЗАТРЫМАЛІ ЗА 200 КМ

**У невядомым кірунку знік злачынец, які ў Жыткавічах пасварыўся са сваёй суседкай і стукнуў яе на ганку ўласнай хаты звычайнай матыкай. Ад атрыманых раненняў пенсіянерка памерла на месцы.**

Пасля гэтага здарэння ўсе супрацоўнікі ДАІ Гомельшчыны былі арыентаваны на тое, што па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства вышукваецца жыхар Жыткавічаў, які, магчыма, рухаецца на мапедзе. Адзінокага кіроўцу гэтага транспартнага сродку заўважылі за 200 км, у Добрушскім раёне. Ішоў моцны дождж, а мужчына нават не спрабаваў знайсці хоць нейкі прытулак. Супрацоўнікі ДАІ спынілі кіроўцу мапеда. Падчас гутаркі ён згадаў, што едзе з Жыткавічаў. Для высвятлення акалічнасцяў супрацоўнікі ДАІ даставілі грамадзяніна ў мясцовы РАУС, дзе было ўстаноўлена, што гэта і ёсць злачынец, якога вышуквае міліцыя.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ХОЗЯЙСТВЕННЫМ СУДОМ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества РСЧУП «Теплотехник», находящегося по адресу: г. Орша, ул. Ленина, 234а.

### НА ТОРГИ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ СЛЕДУЮЩЕЕ ИМУЩЕСТВО:

**ЛОТ № 1** – Автомобиль ГАЗ-САЗ-3507 гос. № АА9769-2, 1990 года выпуска – 1 шт.

Первоначальная стоимость (с учетом НДС) – 7 564 800 рублей.

**ЛОТ № 2** – Автомобиль УАЗ 3303 гос. № АВ1635-2, 1991 года выпуска – 1шт.

Первоначальная стоимость (с учетом НДС) – 3 187 200 рублей.

**Торги будут проводиться по адресу: г. Орша, ул. Мира, 35Б, ком. 2. Время проведения торгов – 4 июля 2011 года в 10.30.**

Минимальная величина первого шага торгов составляет 5 % стоимости лота.

Лицо, желающее принять участие в торгах, не позднее последнего рабочего дня перед торгами обязано:
- подать заявку на участие в торгах;
- дать подписку об отсутствии препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества;
- внести задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости лота на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области р/с № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «СБ Беларусбанк» г. Витебска, код 259, УНП 300007670.

Сумма, внесенная лицом, купившим с торгов имущество, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов внесенные ими суммы возвращаются в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов обязан возместить затраты суда на организацию и проведение торгов.

**По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в хозяйственный суд Витебской области (г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 304), также по телефонам: тел. 8(0212)491341, тел.м. 8(029)3664011 судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, 8(0212)491340 старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, дополнительная информация содержится на сайте хозяйственного суда Витебской области http://court.by.**


## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 30 июня 2011 г. ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Горанский с/с, д. Казельщина | 623681308101000037 | 0,1532 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 260 422 | 12 000 000 | 1 200 000 |
| 2 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000213 | 0,1515 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 178 283 | 17 000 000 | 1 700 000 |
| 3 | Крупицкий с/с, а/г Крупица | 623683906601000498 | 0,1498 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 922 826 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 4 | Крупицкий с/с, а/г Крупица | 623683906601000499 | 0,1498 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 065 367 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 5 | Лошанский с/с, а/г Лошаны, участок № 35 | 623684005601000272 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 894 471 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 6 | Луговослободской с/с, д. Заречье | 623684105601000165 | 0,1158 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 041 385 | 17 000 000 | 1 700 000 |
| 7 | Михановичский с/с, д. Березина, участок № 21 | 623684200601000061 | 0,1330 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 31 000 000 | 3 100 000 |
| 8 | Михановичский с/с, д. Котяги, участок № 10 | 623684203601000243 | 0,1378 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 49 000 000 | 4 900 000 |
| 9 | Острощицко-Городокский с/с, д. Новоселки | 623685205101000255 | 0,1529 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 558 356 | 28 000 000 | 2 800 000 |
| 10 | Острощицко-Городокский с/с, д. Новоселки | 623685205101000257 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 558 356 | 28 000 000 | 2 800 000 |
| 11 | Острошицко-Городокский с/с, д. Узборье | 623685207601000020 | 0,1200 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 300 000 | 14 000 000 | 1 400 000 |
| 12 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 254 | 623687508101001212 | 0,1489 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 015 200 | 25 000 000 | 2 500 000 |
| 13 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 281 | 623687508101001216 | 0,1417 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 015 200 | 24 000 000 | 2 400 000 |
| 14 | Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 446 | 623687508101000985 | 0,1408 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 331 886 | 24 000 000 | 2 400 000 |
| 15 | Хатежинский с/с, д. Старое Село, участок № 56 | 623687507101000502 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 050 840 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 16 | Хатежинский с/с, д. Старое Село, участок № 76 | 623687507101000503 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 050 840 | 23 000 000 | 2 300 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **30.06.2011 г. в 9.30**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **24.06.2011 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 3–4 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лот 5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000046 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На Лот 6 перечисляется на расчетный счет № 3641900000075 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На Лоты 7–8 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лоты 9–11 перечисляется на расчетный счет № 3641000000047 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600208279, код платежа – 04901.

На Лоты 12–16 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.


## ОАО «Дзержинский мотороремонтный завод», 222720 г. Дзержинск, ул. Фоминых, 6
### ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится **04 июля 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Дзержинск, ул. Фоминых, 6, актовый зал. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 10.00 до 10.55. Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, — **27 июня 2011 года.**

**Повестка дня:**

1. О заключении крупной сделки.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 27 июня 2011 г. в бухгалтерии Общества с 10.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

**Совет директоров ОАО «Дзержинский мотороремонтный завод».**

УНП 600005728

**01 июля 2011 года в 12.00 СОСТОИТСЯ ПОВТОРНОЕ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «МИНСКЭНЕРГОСТРОЙ»**

*Повестка дня:*

1. О покупке акций на баланс общества.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации в 11.30.

УНП 100008291

**04 июля 2011 года в 12.00 СОСТОИТСЯ ПОВТОРНОЕ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «МИНСКЭНЕРГОСТРОЙ»**

*Повестка дня:*

1. Об уменьшении размера Уставного фонда общества.
2. О внесении изменений и утверждении Устава общества в новой редакции.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации в 11.30.

УНП 100008291



# БЕЛАВЕЖСКУЮ ПУШЧУ «АКАЛЬЦАВАЛІ» АБХОДАМ

## Не забыліся пра зуброў, ласёў і нават земнаводных

**З генеральным дырэктарам КУП «Брэстаблдарбуд» Пятром СКАРАБАГАЦЬКАМ гутарым аб прынцыпах гаспадарання ў новых умовах**




— **ТОЛЬКІ ЎЗМАЦНІЎШЫ** вытворчы складальнік, калектыў можа дабіцца стабільнасці, — лічыць Пётр Андрэевіч. — Толькі шляхам павышэння арганізаванасці на вытворчасці — па ўсіх накірунках, шляхам павышэння прадукцыйнасці працы, павышэння ўзроўню канечнага прадукту. Прычым дабіцца патрэбнага эфекту важна меншай колькасцю людзей і механізмаў пры самай строгай эканоміі энергарэсурсаў, у тым ліку газу, электраэнергіі, ГЗМ. Здавалася б, усё проста, прапісныя ісціны, але яны «працуюць». Вось пры ўсіх гэтых умовах можна стабілізаваць эканоміку ў калектывах



— Тут новая дарога пройдзе праз Камянецкі раён, — расказвае начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела прадпрыемства Міхаіл КАЗЛОЎСКІ.

у той сітуацыі, калі цэны на матэрыяльныя рэсурсы значна выраслі. І толькі гэта дазволіць разглядаць пытанне аб павышэнні заработнай платы, што зараз становіцца ці не галоўным.

У такім ключы працуюць усе шаснаццаць нашых прадпрыемстваў у раёнах Брэстчыны і ў самім абласным цэнтры. Каб мець магчымасць разлічыцца з падаткамі, выплаціць людзям заработную плату, аплаціць надзвычай дарагія энергарэсурсы і мець сродкі для далейшага развіцця — адным словам, каб дабіцца збалансаванасці гаспадарчага механізма. Вось над чым працуюць нашы калектывы, такую задачу мы ставім.

Думаю, усё ў нас атрымаецца. Мы не дапусцім скарачэння рабочых месцаў, што вельмі важна зараз. Галоўнае — захаваць калектыў, а яшчэ — выдаць больш прадукцыі: больш адрамантаваць кіламетраў, больш выканаць паверхневай апрацоўкі, ямачнага рамонту і наогул ліквідаваць ямачнасць, навесці парадак на вясковых вуліцах, якія мы прынялі на свой баланс. Такая наша паўсядзённая работа, якую можна падзяліць на асноўныя накірункі ў адпаведнасці з дзяржаўнымі праграмамі.

Адна з іх — праграма адраджэння Прыпяцкага Палесся. Па гэтай праграме прадугледжаны вялікія аб'ёмы работ. Згодна з ёю, нам патрэбна асвоіць сёлета толькі ў Столінскім, Лунінецкім і Пінскім раёнах каля 10 мільярдаў рублёў. Мы актыўна прыступілі да работы ў Лунінецкім і Пінскім раёнах, там чыста арганізацыйныя пытанні зняты, у тым ліку па праектна-каштарыснай дакументацыі. Па Столінскім раёне прыступілі да іх вырашэння. Частку сродкаў прапануем накіраваць на капітальны рамонт вуліц райцэнтра. Капітальны рамонт чакае і сельскія вуліцы раёна.

Вялікая работа выконваецца ў адпаведнасці з яшчэ адным указам Прэзідэнта — па будаўніцтве абходу навокал Нацыянальнага парку «Белавежская пушча». Указ быў падпісаны летась у маі, і ён даў нам права ўсё рабіць паралельна — праектаваць і распачынаць падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва. Праз месяц была пракладзена траса — пакуль на паперы, і мы прыступілі да рэалізацыі праекта.

Новая аўтатраса агульнай працягласцю амаль 200 км праходзіць па не вельмі простай мясцовасці, але яна ў многім з'яўляецца тыповай для Беларусі, а таму і цікавай для турыстаў, бо падкрэслівае прыгажосць краю — у асноўным ідзе па лясах, а на некалькіх участках — па самой Белавежскай пушчы, па палях, балотах з глыбінёй залягання торфу два і больш метраў, перасякае ціхія рачулкі... Часткова супадае з дарогамі, якія існавалі раней, але яны ў асноўным будаваліся некалі без усякіх тэхналогій. Проста бульдозерам ссунулі з двух бакоў грунт — вось і ўся дарога. Спатрэбілася пачынаць з нуля.

Аб'ект складаны, хоць бы таму, што ўвод у строй дзейных запланаваны на лістапад гэтага года. На добры лад яго толькі праектаваць патрэбна год. А нам неабходна амаль за гэты тэрмін пабудаваць — з усімі пад'ездамі, з'ездамі, падыходамі. Спатрэбіцца аднаўляць і тэхналагічныя дарогі,



На ўчастку дарогі Амелянец — Панасюкі верхні слой пакрыцця зроблены з шчабёначна-масцічнага асфальтабетону з дабаўленнем цэлюлозы.

прасёлкі: імі карысталіся падчас будаўніцтва, і яны прыйшлі ў такі стан, што нагадваюць франтавыя дарогі.

У якасці заказчыка мы адказваем больш чым за 70 кіламетраў абходу (а гэта 44 працэнты ад агульнай працягласці трасы па Брэсцкай вобласці). У нас на падрадзе працуе каля дзясятка арганізацый. А вось 23 кіламетры трэба пабудаваць уласнымі сіламі. Задача нашым прадпрыемствам — па сілах, хоць яны раней ніколі не выконвалі такіх маштабных аб'ектаў: земляное палатно — 10 метраў, сама шаша — шырынёй 9 метраў, плюс усе спадарожныя элементы. З нашых філіялаў на трасе заняты Брэсцкае, Бярозаўскае, Драгічынскае, Жабінкаўскае, Ганцавіцкае, Ляхавіцкае, Высокаўскае і Кобрынскае ДРБУ. Усе яны паспяхова спраўляюцца з пастаўленай задачай. У тэмпе, яшчэ летась, убралі з будучай трасы лес (спілавалі дрэвы і выкарчавалі пні) і расліннасць, знялі ўрадлівы слой зямлі і вывезлі чарназём, з істотным апераджэннем тэрмінаў зрабілі земляное палатно, выканалі аснову з пяшчана-гравійнай сумесі і ўжо зараз паклалі фактычна ўвесь ніжні слой асфальтабетоннага пакрыцця.

КУП «Брэстаблдарбуд» адным з першых атрымаў дазвола Дэпартамента «Белаўтадар» на ўкладку верхняга слоя асфальтабетоннага пакрыцця і зараз вядзе яе. Для гэтага па ініцыятыве Белгіпрадара прымяняецца новы, вельмі эфектыўны, вельмі моцны матэрыял: шчабёначна-масцічны асфальт з дабаўленнем цэлюлозы.

Такім чынам, практычна дарога ёсць, праезд забяспечаны на ўсёй яе працягласці. Хоць зусім нядаўна не верылася, што ў гэтых суцэльных лясах, балотах сучасная дарога наогул будзе.

Аб'ект пачынаецца ад пагранічнага пераходу Пясчатка на беларуска-польскай мяжы і акружае пушчу па перыметры. Сучасная дарога з асфальтабетону дасць новае жыццё ўсяму рэгіёну. Толькі ў нас каля 70 вёсачак, у якіх з прыходам дарожнікаў пачынаецца новая старонка іх біяграфіі — актывізуецца гаспадарчая дзейнасць, з'явіцца магчымасць для больш імклівага развіцця сацыяльнай базы гаспадарак. Цалкам рэальным робіцца экатурызм, у тым ліку замежны, а гэта — прамыя фінансавыя ўліванні ў рэгіён. Больш упарадкаванымі стануць транспартныя патокі.

І ведаеце, якая яшчэ карысць? Зараз жыхары абласнога цэнтра, навакольных гарадоў і пасёлкаў пачалі актыўна скупляць дамы ў вёсках па новай трасе — пад дачы, і вёсачкі зноў ажываюць. А чаму б і не? Машына ў гараджаніна ёсць, дарога цудоўная, паўгадзіны язды — і ты ў казачным царстве Берандзея. Самі пабачыце, якая там прыгажосць.

Асабіста мне грэе душу і тое, што старыя бацькі ў аддаленых раней вёсках зараз будуць часцей бачыць сваіх дзяцей і ўнукаў. Адным словам, ідэя з «акальцаваннем» пушчы — цудоўная, цалкам апраўданая, яна прынясе велізарную карысць усяму краю. З усведамленнем гэтага і працуем.

Так атрымалася, што найбольш складаныя ўчасткі трасы трапіліся нам. Для прыкладу скажу, што ўпершыню ў сваёй практыцы нам давялося выконваць пад дарожным палатном праходы для зуброў — на тых сцяжынах, што яны натапталі за многія дзесяцігоддзі. Такое патрабаванне экалагічнай экспертызы, ды і проста па-чалавечы зразумелы клопат пра захаванне флоры і фаўны. Аднаўленне паўнацэннага зубрынага сямейства ў Белавежы — наш агульны клопат. Гэтыя пераходы — дастаткова складаныя інжынерныя збудаванні. Кожны манціравалі з 18 буйнагабарытных жалезабетонных блокаў вагой па 12 тон і памерамі 5 на 2,5 метра. Такіх пераходаў на нашым участку тры, імі змогуць карыстацца і алені, дзікі, касулі...

Альбо наступная пазіцыя. У балотах Белавежскай пушчы — вялікая папуляцыя земнаводных, і спрадвечныя шляхі яе міграцыі таксама на нашым участку. Ёсць тут і тыя рэдкія віды жаб, якія занесены ў Чырвоную кнігу. Давялося пракладваць 25 праходаў праз земляное палатно і для іх — жалезабетонныя трубы са спецыяльнымі галерэямі ўздоўж землянога палатна, якія накіроўваюць рух «мігрантаў» у правільным напрамку. Усяго патрэбна было выканаць па індывідуальных чарцяжах, а потым устанавіць больш за 3 тысячы жалезабетонных канструкцый на працягу 3 кіламетраў аўтадарожнага абходу. Так што спецыяльна для «братоў нашых меншых» пракладваем кіламетры труб (мантаж іх завершаны) і кіламетры накіроўвальных дэталяў. Зразумела, гэта цягне за сабой дадатковыя расходы, але робіцца ўсвядомлена: каб зменшыць нагрузку на экалогію Белавежскай пушчы, і яна надалей была красой беларускай зямлі.

Каб адвесці пагрозу затаплення і падтаплення мясцовасці, укладзены водапрапускныя трубы. Завяршаюцца работы на будаўніцтве двух новых мастоў — праз раку Белая ў Камянецкай зоне і раку Левая Лясная ў Пружанскай. (Гэта толькі на нашым участку.)

Адным словам, у калектывах прадпрыемства ідзе напружаная работа па выкананні Указа Прэзідэнта. Вядзецца яна згодна з графікам, з пачатку будаўніцтва асвоена больш за 78 мільярдаў рублёў, у тым ліку ўласнымі сіламі — 21 мільярд. І я не сумняваюся, што здача аб'екта адбудзецца ў вызначаны тэрмін. Тым больш, што мы абапіраемся на новыя тэхналогіі і новыя падыходы да арганізацыі вытворчасці. Тут мы, можна сказаць, «наперадзе планеты ўсёй».

А калі сур'ёзна, то «Брэстаблдарбуд» стаў пляцоўкай укаранення новых рэсурсазберагальных тэхналогій для мясцовых аўтамабільных дарог, распрацаваных намі сумесна з галіновым інстытутам «БелдарНДІ». Можна гаварыць пра шырокае прымяненне бітумных эмульсій, а на іх аснове — так званых халодных тэхналогій. КУП «Брэстаблдарбуд» пры навукова-тэхнічным суправаджэнні дзяржаўнага прадпрыемства «БелдарНДІ» першым у СНД укараніла на мясцовых дарогах сучасную энергазберагальную тэхналогію ўстройства пакрыццяў з эмульсійна-мінеральных сумесяў з паскораным тэрмінам фарміравання.

Магу назваць таксама тэхналогію абяспыльвання і стабілізацыі гравійных пакрыццяў метадам «Сэндвіч» (паўпрапітка), а таксама прыгатаванне і ўкладку асфальтабетонных сумесяў у эканомрэжыме, паверхневую апрацоўку на аснове бітумных эмульсій, халодны рэсайклінг (рэгенерацыю) асфальтабетонных пакрыццяў і іншыя. Усе яны даюць значны эканамічны эфект, вы зможаце ўбачыць іх падчас паездкі.

Не дзіва, што мы пастаянна перавышаем прынятыя на сябе абавязацельствы па эканоміі і беражлівасці. Дарэчы, не магу не сказаць хаця б коратка пра вынікі першага квартала, яны — цудоўныя. Усе паказчыкі — эканамічныя, фінансавыя, аб'ёмныя — выканалі. Стратных прадпрыемстваў у нас няма, а вось прыбытак — ёсць. Выкананы не просты і не лёгкі паказчык рэнтабельнасці. Забяспечаны разумныя суадносіны росту заработнай платы да росту прадукцыйнасці працы. У калектывах ідзе вельмі напружаная работа, і думаю, што праграма другога квартала таксама будзе выканана. Бо і ў красавіку не «падкачалі»: аб'ём выкананых за студзень — красавік работ да адпаведнага перыяду мінулага года склаў у сённяшніх цэнах 179,7 працэнта. Інвестыцый у асноўны капітал пайшло ў 7,7 раза больш. Значыць, клапоцімся і пра заўтрашні дзень.



Работы па ўмацаванні адкоснай часткі сведчаць, што ўчастак дарогі, лічы, гатовы.




Старшы майстар ДРБУ-103 Анатоль КРЭЧКА: «А прыгажосць навокал — казачная!».



Дарога прынясе новае жыццё ў Ваўкаставец.



Дарожныя рабочыя Жабінкаўскага ДРБУ-103 Раман НІКІЦЮК, Аляксандр МЕЛЬНІЧЭНКА, Генадзь КУРОХЦІН і Аляксандр МІХАЛЮК.



Пад'езды да жывёлагадоўчых фермаў — таксама клопат дарожнікаў.

## ТРАСА ПАЧЫНАЕЦЦА КАЛЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ МЯЖЫ

Нашымі «гідамі» на трасе абходу былі начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела «Брэстаблдарбуда» **Міхаіл КАЗЛОЎСКІ** і начальнік сектара падрыхтоўкі работ і тэхразвіцця **Святлана СКАЧКОВА.** Пакуль ехалі да дзяржаўнай мяжы, адкуль і бярэ пачатак новая дарога, Міхаіл Уладзіміравіч расказвае пра справы «цякучыя».

— У сябе ў калектыве з мэтай пашырэння новых, рэсурсазберагальных тэхналогій працягваем праводзіць традыцыйныя семінары-ўзаемаправеркі. Апошні быў у Броннай Гары ў Бярозе, гаспадары дэманстравалі калегам работу цэха па вытворчасці бітумных эмульсій. Размова ішла пра далейшае пашырэнне іх прымянення ў практыцы дарожнага будаўніцтва, у тым ліку на абходзе навокал Белавежскай пушчы. Разглядалі сам ход яго будаўніцтва, а таксама пытанні якасці работ і энергазберажэння. Наведалі аб'екты на тэрыторыі Камянецкага і Пружанскага раёнаў. Такія семінары даўно сталі акадэміяй вытворчага вопыту, яны шмат даюць кіраўнікам і спецыялістам дарожна-будаўнічых упраўленняў.

**— Скажыце, акрамя вас — вашага вялікага калектыву, новыя тэхналогіі, заснаваныя на прымяненні эмульсійна-мінеральных сумесяў (ЭМС), у вобласці нехта яшчэ асвоіў?**

— Пакуль не асвоіў ніхто. Мы ж імі карыстаемся шырока — пры будаўніцтве дарог і выкананні добраўпарадкавання ў аграгарадках, на пад'ездах да жылых домікаў. Нашы заказчыкі ахвотна ідуць на прымяненне ЭМС, бо яны — надзейныя і адначасова больш эканамічныя, больш выгадныя. Абыходзяцца працэнтаў на 30 — 35 танней, чым традыцыйныя.

Задача па эканоміі заўсёды актуальная, асабліва зараз. З-за вялікіх аб'ёмаў работ, выконваемых беларускімі дарожнікамі, узнікае праблема гранітнай шчабёнкі. Стаяла нават пытанне аб закупе яе для выканання абходу за мяжой, ва Украіне, але ж гэта ўсё — валюта. Каб больш ашчадна выкарыстоўваць дэфіцытны матэрыял, вырашана спачатку максімальна пусціць у справу мясцовыя гравійныя пяскі і наогул мясцовыя будаўнічыя матэрыялы, з уласных кар'ераў. Напрыклад, выкарыстоўваем даламітавую шчабёнку, якая больш танная, хоць па сваіх моцнасных паказчыках, безумоўна, уступае граніту. А ўжо потым у справу ідзе гранітная шчабёнка — там, дзе без яе ніяк не абыдзешся.

**— Вуліцы населеных пунктаў, якія вы параўнальна нядаўна прынялі на свой баланс, шмат дастаўляюць клопатаў?**

— Дабавілася амаль 5 тысяч кіламетраў, фактычна на тыя ж рабочыя рукі і тыя ж грошы. А што гэта такое — вуліцы ўнутры населеных пунктаў — вы цудоўна ўяўляеце. Тым не менш, спраўляемся, у дзве мінулыя суровыя зімы ўсе дарогі і вуліцы адстаялі, не дапусцілі перабояў у рабо-



Будзе над ракой Белай новы мост.


«Каманда» Ганцавіцкага ДРБУ-100: Уладзімір РАВІНСКІ, Аляксандр ДУЛІК, Уладзімір СУКАЧ і Аляксандр КРЫСЮК.

це транспарту, забеспячэнні населеных пунктаў прадуктамі харчавання, у функцыянаванні фермаў і іншых гаспадарчых аб'ектаў.

Усе свае «падшэфныя» дарогі і вуліцы падрыхтавалі да эксплуатацыі ў летні перыяд яшчэ да 1 мая — да райцэнтраў, аграгарадкоў і гэтак далей. У тым ліку ліквідавалі ямачнасць, у многім з дапамогай тых жа эмульсійных тэхналогій.

**— Тэма бяспечнасці дарожнага руху таксама актуальная. Скажыце, ці былі выпадкі ДТЗ па віне дарожнікаў?**

— Такіх выпадкаў на мясцовых дарогах Брэстчыны не зафіксавана, каб здарылася ДТЗ менавіта па дарожных умовах. Праблема гэта комплексная — бяспека руху. Тут і «ляжачыя паліцэйскія»; установка інфармацыйных шчытоў і пано; будаўніцтва транспартных развязак (хацелася б, каб на іх узвядзенне выдзяляліся сродкі, бо патрэба ў такіх развязках ёсць, асабліва на перасячэннях з дарогамі рэспубліканскага значэння); і праблема вандалізму на дарогах. Фактаў вандалізму пакуль хапае, зараз пайшла мода на размалёўванне дарожных знакаў фарбамі з балончыкаў. Таму з мэтай кантролю мы арганізавалі «лятучыя атрады», праводзім растлумачальную работу з насельніцтвам.



Гэта і пытанне якаснай дарожнай разметкі — на год запланавана выканаць разметку на 3,5 тысячы кіламетраў, выканалі ўжо больш за 50 працэнтаў.

**— На абходзе, калі прадпрыемства пачынала працаваць, што было самым складаным?**

